**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2025 г.

## <u>Мерапрыемствы у рамках акцыі</u>
## <u>«Наш выбар – жыць з пазітывам»</u>

### 02.12.2025г.

У ЦРБ прайшоў урок здароўя для моладзі «СПИД. Жить, зная факты». На мерапрыемстве дэманстравалі відэаролікі пра СНІД, чыталі вершы. Вядучыя правялі са старшакласнікамі інтэрактыўную гульню. Урач Кобрынскай ЦРБ Васільева Святлана Сяргееўна выступіла перад аўдыторыяй.

ЦРБ

### 12.12.2025г.

У ЦРБ прайшла гадзіна пытанняў і адказаў «Остановись и задумайся!». На мерапрыемстве дэманстравалі відэаматэрыялы, чыталі вершы, правялі інтэрактыўную гульню.

ЦРБ

### 15.12.2025г.

У ЦРБ прайшоў урок - папярэджанне «Вредные привычки: избавься от зависимости». На мерапрыемстве старшакласнікі праслухалі інфармацыю, паглядзелі відэаролікі пра ВІЧ/СНІД, слухалі вершы. У заключэнне была праведзена гульня-апытанне.

ЦРБ

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

### 03.12.2025г.

Напярэдадні святкавання дня нараджэння Брэсцкай вобласці ў ЦРБ прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Каб жыла культура». Вакальны гурт ТЦСАН «Вечарніцы» (кіраўнік Алейнік Ю.В.) паказаў беларускія вячоркі, у час якіх гучалі народныя песні, загадкі, вершы, прымаўкі.

ЦРБ

### 03.12.2025г.

У рамках праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию в жизни» у філіяле «Дзівінская сельская бібліятэка» прайшла гадзіна разважанняў «Мы дарим вам тепло души». Пратаіерэй Валерый Барадзін

пагаварыў пра дабрыню і спагаду. Член Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Надзея Момлік прачытала свае вершы.

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**05.12.2025г.**

У ЦРБ прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Сильные духом, вам посвящается!», прымеркаваная да Міжнароднага дня інвалідаў. На мерапрыемстве гучалі песні вакальнага гурта «Фантазія» і бібліятэкара Дзівінскай публічнай бібліятэкі Таццяны Гурыш.

ЦРБ

**05.12.2025г.**

У філіяле «Залеская сельская бібліятэка» прайшлі духоўна-асветніцкія чытанні «Путешествие к своей душе». У чытаннях прыняў удзел настаяцель храма святых апосталаў Пятра і Паўла г. Кобрына Аляксандр Канцэвіч. Для слухачоў падрыхтавана падборка праваслаўнай літаратуры «Когда и слово душу лечит».

Філіял «Залеская сельская бібліятэка»

**08.12.2025г.**

У ЦРБ, у рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай РЦБС і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Библиотека и нотариат: взаимовыгодное сотрудничество» праведзена чарговае індывідуальнае кансультаванне грамадзян па натарыяльных пытаннях. Натарыус натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Наталля Мікалаеўна Марчук дала кампетэнтныя кансультацыі ўсім, хто звярнуўся.

ЦРБ

**19.12.2025г.**

У ЦРБ прайшоў раённы Дзень бібліятэкара «Подводим итоги года: опыт, творчество, креатив». За актыўную працу з чытачамі ў рамках рэалізацыі сацыякультурнага праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию в жизни» дыпломам узнагароджана бібліятэкар 1 катэгорыі філіяла «Дзівінская сельская бібліятэка» Гурыш Таццяна Аляксандраўна. Дыпломам у намінацыі «Бібліятэкар года – 2025» узнагароджана Жылінская Алена Аляксандраўна, бібліятэкар аддзела маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы.

**24.12.2025г.**

Падведзены вынікі раённага конкурсу на лепшую пастаноўку работы з дзецьмі і падлеткамі ў рамках сацыякультурнага праекта «Объединить, заинтересовать, увлечь». Пераможцамі сталі філіял «Дзіцячая бібліятэка», Гарадзецкая, Магдалінская і Тэвельская сельскія бібліятэкі.

Па выніках раённага конкурсу прафесійнага майстэрства «Люблю мой край, старонку гэту» пераможцамі сталі Лукская сельская бібліятэка, Залеская сельская бібліятэка, Дзівінская сельская бібліятэка і Акцябрская сельская бібліятэка. За актыўную працу з чытачамі ў рамках рэалізацыі сацыякультурнага праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию в жизни» дыпломам узнагароджана бібліятэкар 1 катэгорыі Гурыш Таццяна Аляксандраўна. Дыпломам у намінацыі «Бібліятэкар года – 2025» узнагароджана Жылінская Алена Аляксандраўна.

ЦРБ

Выканаўца
Горава Н. Ю.
80164238581